# *Эліза Ажэшка*

(6.6.1841 – 18.5.1910)

Польскамоўная пісьменніца рэалістычнага кірунку, палымяны гуманіст і дэмакрат (дзявочае Паўлоўская). Нарадзілася ў былым маёнтку Мількаўшчына Гродзенскага павета, добра ведала беларускую мову. Выхоўвалася ў манастырскім пансіёне ў Варшаве (1852 – 1857). Да вяршынь тагачаснай еўрапейскай культуры паднялася дзякуючы самаадукацыі, назаўсёды захавала веру ў навуку і чалавечы розум. Выключную ролю ў фарміраванні яе светапогляду адыгралі нацыянальна-вызваленчая барацьба польскага і беларускага народаў і сялянская рэформа на Беларусі 1860-х гадоў, якія яна назвала «сваімі універсітэтамі».

Э.Ажэшка пісала: «Гэты момант зрабіў рашучы ўплыў на маю будучыню... Гэты момант запаліў ва мне жаданне служыць Радзіме па меры сіл і характару маіх здольнасцей; з яго агню і слёз узнікла ва мне жаданне прынесці хоць маленькую цаглінку для таго выратавальнага моста над безданню, праз які павінен быў прайсці народ... Пазней мяне апаноўвалі ўсякія сумненні, але ў ідэі любасці да Радзімы і абавязку служыць ёй я ніколі не сумнявалася... Усё гэта зрабіў са мной і ва мне год 1863. Калі б не яго молат і разец, мой лёс быў бы іншы і, відаць, я не стала б пісьменніцай».

У час паўстання 1863 – 1864 Ажэшка была сувязной партызанскага атрада Р.Траўгута, які дзейнічаў на Кобрыншчыне, дапамагала медыкаментамі, харчаваннем, хавала ў маёнтку Траўгута пасля разгрому яго атрада, а потым, рызыкуючы жыццём, адвезла яго да граніц Польшчы. У 1869 пераехала на сталае жыхарства ў Гродна, дзе і памерла.

Літаратурную дзейнасць пачала ў 1866 апавяданнем «Малюнак з галодных гадоў»(гісторыя кахання і смерці маладых прыгонных-беларусаў Ганны і Васілька), навеяным успамінамі пра голад беларускай прыгоннай вёскі. У далейшым Ажэшка звяртаецца да жанру аповесці і рамана, аднак яе раннія раманы канца 1860-х гадоў – «Апошняе каханне», «У клетцы», «На правінцыі»– схематычныя, носяць маралізатарскі характар. Станоўчымі вобразамі пісьменніца робіць капіталістычных дзялкоў, чым выяўляе ідэалы «варшаўскага пазітывізму»наконт буржуазнага прагрэсу і ўсеагульнага дабрабыту.

У гэты час у Польшчы адбываюцца эканамічныя зрухі, фарміруецца клас буржуазіі, якая прыносіць новую мараль. Пасля падаўлення паўстання сцверджаныя рамантыкамі ідэалы не ўвасобіліся ў жыцці, апаэтызаваны імі герой аказаўся не здольным змяніць рэчаіснасць. На змену рамантызму, як рэакцыя на яго, прыходзіць новы літаратурны кірунак – пазітывізм (прадстаўнікі Э.Ажэшка, А.Плуг, А.Гурыновіч. Я.Лучына). Адзін з лозунгаў пазітывістаў – быць рэалістычным, не адыходзіць ад сапраўднага жыцця ў містыку, легенды. Пазітывізм нёс разуменне таго, што навукова-тэхнічны прагрэс спрыяе дабрабыту грамадства, але цывілізацыя разбурае чалавечую душу.

Тым не менш рэчаіснасць абвергла лозунгі пазітывістаў, паказала нежыццяздольнасць іх ідэй. Э.Ажэшка пераасэнсавала свае пазіцыі,

перагледзела канцэпцыю «тэндэнцыйнага»рамана, каб стаць мастаком-рэалістам. У яе раманах «Пампалінскія»і «Сям'я Брохвічаў»(абодва 1876) сатырычна намаляваны саслоўная фанабэрыя, эгаізм і паразітычнае існаванне шляхецкай арыстакратыі. У 1870-я гады пісьменніца становіцца на чале жаночага руху ў Польшчы, выступае з артыкуламі «Аб жаночым пытанні»і «Некалькі слоў пра жанчын»(абодва 1870), у якіх вылучае дзве асноўныя праблемы: палітычнага і сацыяльнага раўнапраўя жанчын і карэннай змены іх выхавання, падрыхтоўкі да карыснай прафесійнай і грамадскай дзейнасці. У лепшых яе творах, у тым ліку і беларускай тэматыкі, жанчына становіцца галоўнай гераіняй, вялікая ўвага аддаецца паказу яе драматычнага лёсу.

Шырокую вядомасць на радзіме і за мяжой атрымаў раман «Марта»(1873), прасякнуты палымяным пратэстам супраць рабства жанчыны ў тагачасным свеце. Імкненнем актыўна ўплываць на грамадскую свядомасць пазначаны зборнік апавяданняў «З розных сфер», дзе пісьменніца выступіла ў абарону пакрыўджанай беднаты, імкнулася паказаць, «як жыве, што думае і адчувае чалавек у маленькай хатцы з акенцам ля самай зямлі».

1880-я гады – час найвышэйшага ўздыму творчасці Ажэшкі. Э.Ажэшка вельмі добра ведала жыццё парэформеннай беларускай вёскі з усімі яго праблемамі і не заставалася абыякавымі да лёсу сялян.

Паказу беларускага жыцця прасвечаны аповесці «Нізіны»(1884), «Дзюрдзі»(1885), «Хам»(1888), апавяданні «Рэха», «Тадэвуш», «У зімовы вечар», «На следстве»і інш. Творы пра цяжкае жыццё беларускага народа прасякнуты палымяным гуманістычным пафасам, пісьменніца раскрывае лепшыя рысы нацыянальнага характару беларуса, сцверджае задаткі вялікага развіцця, што тояцца ў прыніжаным, але стойкім і цярплівым народзе.

«Нізіны»(1884, першапачатковая назва «Танная невялічкая кніжка для люду»). Героі аповесці – батракі, што жывуць у чацвяраках (сялянскай хаце, разбітай на чатыры часткі), па дзве сям'і ў кожным. У цэнтры пісьменніцкай увагі – сялянка Хрысціна, якая мае двух сыноў Піліпку і Антоську. Іх бацька, аканом Стафан Бахрэвіч, некалі кахаў яе, некалькі разоў праганяў засланых да яе сватоў, але розум атрымаў перамогу над сэрцам: Стафан ажаніўся са шляхцянкай Мадзяй, дачкой асэсара (паліцэйскага). Піліпку забіраюць салдаты, Бахрэвіч адмаўляе Хрысціне ў дапамозе. Па навучанні былога салдата Мікалая, пасрэдніка адваката Капроўскага, Хрысціна ўсе грошы аддае на вызваленне сына (свае, Піліпавы, Антосевы), аднак марна. Карцёжнік і гуляка Капроўскі нават не пачынаў займацца яе справай. У фінале аповесці Хрысціна атрымлівае развітальны ліст ад сына, ёй усё становіцца зразумела. Пачцівы і добры малодшы сын Антоська, даведаўшыся, што маці растраціла і яго грошы (меў намер ажаніцца, стаць гаспадаром), абражае і жанчыну, падымае на яе руку, накіроўваецца да карчмы – лёс яго прадвызначаны.

Да адваката звяртаецца Ясюк Гарбар, у якога дзядзька адабраў зямлю, а пазней і сам дзядзька Паўлюк, багацейшы за пляменніка, можна меркаваць, што справа вырашыцца ня карысць апошняга. Ясюк улез у пазыку, з адчаю і злосці пацягнуўся да гарэлкі, моцна збівае дзядзьку (нават паслалі за паліцыяй).

Яшчэ адна сюжэтная лінія: узаемаадносіны Карольці Бахрэвіч з Людвікам Капроўскім. Адвакат падманвае дзяўчыну і адмаўляецца ад аканомавай дачкі, як некалі Бахрэвіч адмовіўся ад сялянкі.

У гэтым творы паказана зараджэнне капіталістычных адносін у вёсцы. Так салдат Мікалай і адвакат Капроўскі заключылі паміж сабой дамову, па якой салдат атрымлівае частку грошай з кожнага кліента. Паказваецца і першапачатковае накапленне капіталу: адвакат Капроўскі, асобы, на якіх ён хоча быць падобным. Праблема сацыяльнай няроўнасці, шлюба па разліку, адплаты за свае ўчынкі (Бахрэвіч і Хрысціна, Бахрэвіч і Мадзя, Бахрэвіч-Карольця-Капроўскі).

Ажэшка паказвае сваіх герояў ў сітуацыі безвыходнасці, раскрывае трагізм лёсаў простых людзей. Выразна адчуваюцца адносіны пісьменніцы да персанажаў: з іроніяй, сарказмам яна апісвае жонку і дачок Бахрэвіча, адваката, з цеплынеў і спагадай стварае вобразы сялян.

Цэнтральная ў аповесці «Дзюрдзі»(1885) праблема злачынства і пакарання. Твор пачынаецца пралогам-судом і заканчваецца эпілогам-судом над чатырма братамі па прозвішчы Дзюрдзі, што забілі «вядзьмарку»– кавалёву жонку Пятрусю. Добрая і спагадлівая да ўсіх, шчаслівая ў замужжы, маладая жанчына стала ахвярай народных забабонаў і цемрашальства. Э.Ажэшка даследуе народную драму, паказвае, як фаталізм, немагчымасць растлумачыць жыццёвыя з'явы, містычныя супадзенні прывялі звычайных працавітых сялян да стыхійнага забойства ні ў чым непавіннага чалавека.
(Каровы мала даюць малака не таму, што малако забірае ведзьма, а таму, што няма травы на папасе; Клеменс Дзюрдзя захварэў не таму, што выпіў прываротнага зелля, а таму што прастудзіўся; сяляне не могуць знайсці дарогу дадому не таму, што дарогу зблытала ведзьма, а таму што п'яныя і вялікая завіруха і пад.

У кожнага з Дзюрдзяў свая прычына злосці на Пятрусю: Пётра не можа дараваць нібыта выкліканую яе вядзьмарствам хваробу сына; стрыечны брат Сцяпан закаханы ў яе, не шчаслівы з жонкай, лічыць, што Пятруся яго прычаравала; п'яніцу Сымону жанчына не пазычыла грошай, якіх не мела.)

Палемічна завостраная і парадаксальная назва аповесці «Хам»(1888). «Хамам»называлі простых людзей. Франка, якая лічыць сябе вышэйшай, называе хамам Паўла Кабыцкага, у вобразе якога ўвасабляюцца ідэал натуральнага чалавека, лепшыя рысы народа. Паўлам кіруе не толькі пачуццё кахання, калі ён звязвае лёс з прапашчай жанчынай Франкай, але і вера ў тое, што ён зможа выратаваць чалавечую душу. Яго маральная місія – вырваць Франку, ахвяру урбаністычнай «панскай»цывілізацыі, з кіпцюроў зла. Франка робіць рыбаку і яго блізкі шмат непрыемнасцяў (збягае з панскім лёкаем у горад, вяртаецца з дзіцём на руках, сварыцца і б'ецца з яго сястой Ульянай, кахаецца з братам швагера дваццацігадовым Данілкам, праклінае ўсіх і г.д.). Аднак Павел вінаваціць не яе, а сябе за тое, што не правільна выхоўвае жонку і моцна пакутуе. Перад самай смерцю Франка прызнаецца такой жа, як і сама, ахвяры панскага жыцця жабрачцы Марцэлі, што баіцца сама сябе, не можа глядзець у вочы Паўлу і канчае жыццё самагубствам.

Фінал (эпілог) аповесці, аднак, аптымістычны, скіраваны ў будучыню: праз некалькі год пасля смерці Франкі стары рыбак і сын Франкі Актавіян жывуць у вялікай згодзе.

Раман «Над Нёманам»(1887) уздымае надзённыя праблемы тагачаснай рэчаіснасці. У творы арганічна пераплятаюцца некалькі сюжэтных ліній: 1) пошукі свайго месца ў гэтым жыцці галоўнай гераіняй; 2) дэмакратычная інтэлігенцыя двара Карчыньскіх з моцнымі традыцыямі нацыянальна-вызваленчай барацьбы; 3) шляхецкі засценак Багатыровічаў, што жыве сялянскім жыццём з усёй яго паэзіяй працы; 4) група арыстакратаў-паразітаў, адарваных ад народнага жыцця (вечна хворая Эмілія Карчыньская, сын аднаго з кіраўнікоў паўстання мастак Зыгмунд Карчыньскі, марфініст Ружыц, безгаспадарны Кірла).

Цэнтральная праблема твора – нацыянальнае адраджэнне краіны, якое можа ажыццявіцца талькі сумеснымі намаганнямі розных колаў грамадства. Лейтматывам рамана з’яўляецца ідэя сацыяльнага кампрамісу, якая вырашаецца на прыкладзе легендарных заснавальнікаў роду Багатыровічаў Яна і Цэцыліі, змагароў за вольнасць памешчыка Анджэя Карчыньскага і засцянковага шляхціча Ежы Багатыровіча, пахаваных у адной магіле, а таксама закаханых Юстыны і Яна.

Фальклору беларусаў прысвечаны паэтычныя нарысы «Людзі і кветкі па берагах Нёмана»(1888 – 91). У вуснапаэтычнай творчасці Ажэшка бачыць выяўленне духоўнага багацця беларусаў. Пісьменніца збірала і сама рабіла фальклорныя запісы. Бясспрэчнымі доказамі розуму і пачуцця прыгожага ў беларусаў яна лічыла лірычную народную песню, баладу, паэтычныя назвы раслін, народную медыцыну.

«Вельмі пашырана думка, – пісала Ажэшка, – што сяляне зусім абыякавыя да навакольнай прыроды, яе хараства і не заўважаюць з’яў, што не ўплываюць на іх штодзённае жыццё. Дзіўна, як такая думка можа існаваць, калі ёсць народная песня, у якой урыўкамі і ў рознай ступені пластычнасці, але густа рассеяны малюнкі прыроды і назіранні над яе з’явамі. Гэтай думцы без сумнення супярэчыць таксама і веданне народам расліннага свету, настолькі дакладнае, што смела можна сцвярджаць: ад самага высокага дрэва да найменшай былінкі, якія растуць на той жа зямлі, што і ён, няма такой расліны, якая ў яго мове не мела б свае назвы, а ўжо ў гэтых назвах выяўляецца назіральнасць, выказаная ў жывапіснай і паэтычнай, іншы раз грубай, але выразнай форме».

Апошні зборнік навел «Clorія VICTIS»(«Слава пераможаным!», 1910) услаўляе герояў паўстання 1863 – 1864 і традыцыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Пасля смерці пісьменніцы ў 1911 годзе ў Віленскай судовай палаце адбыўся суд над яе апошняй кнігай. Па рашэнні Часовага камітэту па справах друку кніга (агульны тыраж складаў 3000 асобнікаў) была канфіскавана, але ў кнігарнях засталося 20 экзэмпляраў, якія былі імгненна раскуплены.

Апошнія гады жыцця Ажэшкі цесна звязаны з беларускай мясцовасцю Фларыянаў, дзе ў маёнтку Бохвіца (цяпер землі калгаса імя Ламаносава) у час летняга адпачынку пісьменніца збірала польскую і беларускую інтэлігенцыю,

там наладжваліся літаратурныя і музычныя вечары, спектаклі. Падтрымліваючы творчыя сувязі з дзеячамі культуры славянскіх народаў, Ажэшка цікавілася беларускай і ўкраінскай літаратурай, вяла актыўную перапіску з І.Франко, сябравала з Ф.Багушэвічам, высока ставіла яго творчасць і прапагандавала яе.